УДК 739.2.033(476)

**Н. І. Наркевіч**, кандыдат мастацтвазнаўства, асістэнт (БДТУ)

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ СТЫЛЮ БАРОКА Ў ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЮВЕЛІРНАЙ СПРАВЫ)

У публікацыі разглядаецца інтэнсіўнае развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў эпоху барока. Падкрэсліваюцца асаблівасці новага стылю ў беларускім мастацтве, якое ў складаных, спецыфічных умовах захавала сваю нацыянальную адметнасць. Звяртаецца ўвага на самабытнасць ювелірнай справы XVI–XVIII стст. як адной з галін дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, унікальнасць новага стылю, які заўсёды існуе ў пэўных нацыянальных варыянтах, праяўляе сябе як дынамічная сістэма, здольная да развіцця, выкарыстання і актыўнага засваення навацыйных з'яў. Асаблівая ўвага надаецца рамесленым аб'яднанням, творчасці майстроў залатых і сярэбраных спраў, якія, засвоіўшы новыя тэхнічныя прыёмы апрацоўкі металу, арнаментыку барока, стварылі свой лакальны варыянт барочнага мастацтва.

Intensive development of the decorative and applied arts of Belarus in the Baroque era is described in the article. The author shows new style of Belorussian art (with its national peculiarities saved in specific conditions) as the unique one. Emphasizes the originality of jewelry works in the XVI–XVIIIth centuries as a type of decorative and applied arts, the uniqueness of the new style, which always exists in certain national variations, manifests itself as a dynamic system capable of development, the use of active learning, and the latest characteristics. Special attention he pays to the workshops of artists working with gold and silver (who mastered the new method of metalworking to create their local version of Baroque art).

**Уводзіны.** Мастацтва барока ў Беларусі – важная і значная з'ява не толькі ў мясцовай культуры, але і ў культуры ўсёй Усходняй Еўропы. Стыль барока ў Беларусі быў засвоены ў канцы XVI – першай палове XVII ст., і яго развіццё працягвалася амаль да канца XVIII ст.

Мэта дадзенай публікацыі – разгледзець асаблівасці стылю барока ў айчынным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Пры даследаванні станаўлення барока на Беларусі канцэнтруем увагу пераважна на ювелірным мастацтве, бо помнікі ювелірнай справы з'яўляюцца адной з крыніц вывучэння культурнай спадчыны краіны. Якраз на гэтым матэрыяле можна назіраць найбольш дакладнае адлюстраванне стылістычных тэндэнцый.

**Асноўная частка.** Зразумець самабытнасць беларускага барока немагчыма без уліку тагачаснага палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця. Важнымі грамадскімі і канфесійнымі падзеямі XVII ст., якія паўплывалі на беларускае мастацтва, сталі ўтварэнне Рэчы Паспалітай і ўзнікненне ўніяцкай (грэка-каталіцкай) канфесіі. Новая дзяржава, створаная ў выніку падпісання Люблінскай уніі 1569 г., была федэратыўным аб'яднаннем. У ім на роўных правах суіснавалі землі Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Уся паўната ўлады належала сейму і каралю, які абіраўся пажыццёва і адначасова з'яўляўся вялікім князем. Не меншай уплывовасцю вызначалася заможная шляхта, магнатэрыя, інтарэсы якой часта ставіліся на ўзровень дзяржаўных. Палітычны і культурны ўплыў Польшчы на нашу краіну адмаўляць нельга. Ён быў непазбежны ў перыяд контррэфармацыі з яе актывізацыяй каталіцызму, паступовым пераходам у яго пануючых вярхоў грамадства, спробай лацінізацыі праваслаўнай царквы, якую паслядоўна ажыццяўлялі францысканцы, дамініканцы і асабліва езуіты. Важную ролю мелі асаблівасці канфесійнай і этнічнай структуры грамадства, шэраг іншых агульнадзяржаўных фактараў і ў першую чаргу сармацкая культура, якая ў гэтыя часы трывала ўсталявалася ў асяроддзі шляхты.

Наяўнасць вялікай колькасці датаваных твораў дазваляе прасачыць дакладныя этапы развіцця стылю ў Беларусі: ранняе барока (канец XVI – першая палова XVII ст.), сталае (сярэдзіна – другая палова XVII ст. – 30-я гг. XVIII ст.) і позняе (30–80-я гг. XVIII ст.) [1, с. 47; 2, с. 5–10]. Не выклікае сумненняў, што ад барока засталася ў нас самая значная колькасць мастацкіх помнікаў (і гэта пры тым, што якраз у дадзены перыяд, асабліва ў так званую руска-польскую вайну 1654–1667 гг., многія з іх былі знішчаны). Менавіта ў гэтых складаных, спецыфічных умовах беларускае мастацтва захавала сваю нацыянальную адметнасць. Так, нягледзячы на заходнееўрапейскія ўплывы, яго візантыйская першаснова не знікла і заставалася вельмі важнай асаблівасцю ў фарміраванні новага стылю [3, с. 5]. Уздзеянне на беларускае мастацтва барока ўспрымалася нашымі майстрамі з улікам гэтай першаасновы. У гэтым, думаецца, адна з прычын унікальнасці і самабытнасці

айчыннага мастацтва, не падобнага ні на рускае, ні на польскае (першае не ведала ні готыкі, ні рэнесансу, а да барока далучалася праз Беларусь; другое праз нашу краіну засвойвала чужую ў прынцыпе для Польшчы візантыйскую традыцыю).

Стыль барока, які зарадзіўся ў Італіі ў канцы XVI ст., адлюстроўваў інтарэсы каталіцкай царквы і павінен быў сродкамі мастацтва ствараць ілюзію сацыяльнага і палітычнага дабрабыту. Новы тып светаўспрымання сцвярджаў экспрэсію, шматзначнасць, драматычную зняверчанасць жыцця, уяўленні пра бязмежнасць сусвету. У эстэтыцы барока павялічваецца цікавасць не толькі да дасканалых праяў быцця, але і да фантастычнага, дысгарманічнага, гратэскавага. Узрастае значнасць відовішчных элементаў, эфектнага ўздзеяння. Адчуванне прыгажосці набліжалася да перажывання цудоўнага.

Многія віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва актыўна ўключаюцца ў інтэр'ер, набываюць манументальна-дэкаратыўны характар. У аздабленні палацаў і храмаў шырока скарыстоўваецца рэльефная паліхромная кафля, мастацкае кавальства, чаканка і асабліва разьба па дрэве, якая дасягнула ў XVII ст. свайго росквіту і найбольш ярка праявіла сябе ў аздабленні праваслаўных храмаў. Засвоіўшы лепшыя дасягненні заходнееўрапейскага мастацтва і злучыўшы іх з мясцовымі мастацкімі традыцыямі, беларускія майстры стварылі свой тыпова беларускі варыянт барочнай разьбы.

Інтэнсіўнае развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на Беларусі ў эпоху барока было абумоўлена аб'яднаннямі рамеснікаў у цэхі. Найбольш развітыя формы такіх прафесійных аб'яднанняў адносяцца да XVI–XVII стст. Першы ювелірны цэх у Вялікім Княстве Літоўскім быў заснаваны ў 1495 г. у Вільні вялікім князем Аляксандрам па ініцыятыве злотнікаў нямецкага паходжання [4, с. 539]. У 1516 г. Жыгімонт І Стары пацвердзіў цэхавы статут. Вядомы імёны 115 віленскіх злотнікаў да канца XVI ст., сярод іх 48 немцаў, 23 майстры перасяліліся з Польшчы (у асноўным з Кракава). Наплыў у краіну польскіх рамеснікаў адзначаецца пасля 1544 г. На велікакняжацкім двары працавалі майстры і з іншых краін Еўропы. Мяркуецца, што ў сярэдзіне XVII ст. у Вільні ўзнік яўрэўскі злотніцкі цэх. У XVII–XVIII стст. сярод віленскіх злотнікаў трывалыя пазіцыі захоўвалі майстры нямецкага паходжання, з сярэдзіны XVIII ст. узмацніліся пазіцыі яўрэйскіх рамеснікаў.

Мастры ювелірнай справы Гродна, Мінска, Бярэсця, Магілёва, Полацка, Віцебска і іншых гарадоў спачатку прызнавалі аўтарытэт віленскага злотніцкага цэха як галоўнага адукацыйнага цэнтра ювеліраў Вялікага Княства Літоўскага. Паступова рамесленыя аб'яднанні гэтых гарадоў дабіліся ўраўноўвання сваіх правоў з віленскім цэхам.

Значная колькасць вучняў сведчыць пра тое, што віленскі ювелірны цэх складаўся з кваліфікаваных майстроў. Усяго ў 1650–1750 гг. пачатковае і майстэрскае навучанне ў цэху атрымалі больш як 250 чалавек з розных гарадоў. Адзначаючы высокі прафесіяналізм цэхавых рамеснікаў, неабходна вылучыць выключна высокі кваліфікацыйны ўзровень майстроў з Полацка, Слоніма, Дзісны, Глыбокага. Толькі ў 1660–1800 гг. з гэтых гарадоў былі атэставаны каля 200 ювеліраў [4, с. 540].

Побач са злотнікамі працавалі сярэбранікі, якія спецыялізаваліся на творах з серабра. Майстры выраблялі для палацаў і храмаў посуд, начынне, абклады абразоў і кніг, мужчынскія і жаночыя ўпрыгажэнні, аздаблялі вупраж і зброю, рэзалі пячаткі. Заказчыкамі ювелірных вырабаў выступалі магнаты, заможная павятовая шляхта, царкоўная іерархія, гарадскі патрыцыят, купецтва.

Для сведчання якасці на вырабы з каштоўных металаў ставіліся клеймы. Вядомы віленскія цэхавыя клеймы, якія мелі выяву св. Элігія і кубка, гарадскія – герба «Калюмны» і перакрыжаваных чатырох рысак. Клеймы на творах ювелірнага мастацтва іншых гарадоў Вялікага Княства Літоўскага невядомы.

Мастацкая апрацоўка металу развівалася ў цеснай узаемасувязі з іншымі відамі мастацтва, што спрыяла вызначэнню іх стылістычнага адзінства. Сінтэз еўрапейскага ўплыву і нацыянальных напрацовак прадыктаваў адпаведныя змены формы і стылістыкі вырабаў, выявіў здольнасць ювелірнага мастацтва да грунтоўных змен, якія адбываліся і ў архітэктуры, і ў пластычных відах мастацтва.

Стыль барока з яго ўрачыстай пышнасцю, пампезнасцю, павышанай дэкаратыўнасцю набыў у Беларусі лакальны характар, мясцовыя асаблівасці. У значнай ступені гэтаму садзейнічалі як густы заказчыкаў, так і прыток у краіну іншаземных майстроў, якія абапіраліся на традыцыі беларускага народнага мастацтва.

У вырабах канца XVI – пачатку XVII ст. яшчэ назіраюцца рысы рэнесансу (кубкі, паясы з Брэста, рашоткі ў Вішневе), гатызаваныя элементы, ці так званае «гатычнае барока» (рамы алтарных карцін у Пінску і Будславе, пушка-цыборыум у Полацку). Узмацненне рыс стылю бачна ў пласціне (1640 г.), абразе (1652 г.). У творах яшчэ нясмела ўведзены арнаментальны матыў кнорпеля (армушля). Пазней, засвоіўшы моду на кветкавы арнамент (blumenmode), што зарадзіўся ў 1650–1660-х гг. у Галандыі, майстры ад абстрактнага дэкору пераходзяць да сакавітага расліннага арнаменту [5, с. 14].

Ва ўсіх відах мастацтва адбылося станаўленне новага стылю, засваенне арнаментыкі і тэхнічных прыёмаў, у той жа час назіраўся складаны працэс развіцця мастацкіх школ. Вялікая роля ў станаўленні і развіцці мясцовай школы належыць залатых спраў майстрам з Германіі, Галандыі, Італіі, Польшчы, Літвы, Украіны. Гэта, з аднаго боку, садзейнічала ўплыву барока на беларускае мастацтва, з другога – пашырэнню новых тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў, матываў і відаў дэкору. Міграцыя рамеснікаў асабліва вялікая, бо іх творчасць была патрэбна не толькі заможным слаям насельніцтва, але і простаму люду. Іншаземныя майстры неслі з сабой сакрэты вытворчасці, таямніцы рамяства, якія затым засвойваліся лепшымі мясцовымі ўмельцамі і атрымлівалі своеасаблівую нацыянальную афарбоўку [6, с. 21].

Творы майстроў-ювеліраў набываюць дынамічную кампазіцыю, дэкаратыўную пышнасць, пластычнасць і экспрэсіўнасць форм. Плоскасны, абстрактны характар дэкору саступае месца аб’ёмнасці і шматпланавасці; у спалучэнні з дынамічна выгнутымі ракавінападобнымі элементамі, вітымі калонкамі, фігурнымі выявамі шырока ўжываецца багаты раслінны арнамент, мода на які панавала ва ўсёй Еўропе.

У помніках сталага барока да натуралістычнасці рэльефна прачаканьваюцца цюльпаны, макі, гваздзікі, нарцысы, півоні, ландышы на невялікіх сцяблах (рыза алтарнай карціны ў Камаях; паддон манстранцыя, 1692 г., Нясвіж) ці на больш пышных і доўгіх (табернакулум, 1677 г., Нясвіж, абклад абраза са Старых Дзявяткавічаў).

Адзін з асноўных дэкаратыўных матываў сталага барока – акант – з’яўляецца ў творах Беларусі з 1666 г. (пацір з Ружан), трымаецца да канца XVII ст. (абклад Мшала, 1695 г.) і ў больш засушаным выглядзе выкарыстоўваецца майстрамі XVIII ст. Новыя арнаментальныя матывы пачынаюць пранікаць і ў помнікі рэлігійнага культу для праваслаўнай царквы. У напрастольных крыжах (1636 г., 1672 г.), у якіх бачна пераемная сувязь з работай давыд-гарадоцкага рамесніка канца XVI – пачатку XVII ст., што вызначаецца ў плоскаснасці дэкарыроўкі формы, ужо ўводзіцца кветкавы арнамент, змяняецца форма крыжа.

У ювелірнай справе сярэдзіны – другой паловы XVII ст. адбылося засваенне новых арнаментальных матываў і прыёмаў чаканкі. Засвоіўшы моду на кветкавы арнамент, беларускія майстры ад абстрактнага дэкору пераходзяць да сакавітага барочнага расліннага арнаменту. Новыя прыёмы чаканкі рамеснікі спалучаюць з ліццём па форме, гравіраваннем, філігранню, чарненнем, павышаным рэльефам («Божая маці Адзігітрыя» са Слуцка, Крыж дзісненскага брацтва (1673 г.), абклад Евангелля з Урэчча). Поспехі майстроў знайшлі яркае ўвасабленне ў абкладзе Евангелля канца XVII ст. – 1703 г. у Дзісне. Пышны раслінны чаканены арнамент рознавысокага рэльефу з аканта, фруктаў, крылатых анёлаў абрамляе цэнтральную драбніцу абклада з выявай Уваскрэсення Хрыстова, дзе спалучаюцца ўсходне- і заходнееўрапейскі іканаграфічныя зводы. Пры агульнаеўрапейскай эвалюцыі стыляў (XVI–XVIII стст.) для айчынных майстроў характэрны канкрэтнасць і рацыяналістычнасць мыслення, непарыўная сувязь з фальклорнымі традыцыямі і амаль поўная адсутнасць цікавасці да абстрактнай арнаментыкі.

Беларускія майстры сярэбранай і залатой справы ўнеслі значны ўклад у станаўленне барока ў Расіі і развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва другой паловы XVII ст. Мясцовы варыянт барочнага мастацтва рамеснікі перанеслі ў суседнюю дзяржаву, куды падчас руска-польскай вайны перасяліліся ў ліку многіх выхадцаў з Беларусі. Вялікая група беларускіх майстроў-ювеліраў з Віцебска, Полацка, Вільні, Копысі, Мінска ў другой палове XVII ст. працавала ў Маскве. Сярод іх былі майстры скані, сусальнага серабра, чаканшчыкі, ліцейшчыкі, гравіравальшчыкі і іншыя [7, с. 131]. Яны выраблялі для царскага двара разнастайны сталовы посуд, а для палацавых і гарадскіх храмаў – кадзілы, чашы, паціры, абклады абразоў і кніг. Фёдар Мікулаеў, «чеканщик и черненого дела жалованный мастер», вырабляў абклады абразоў, аздобленыя чаканкай, дэісусы і рознае царкоўнае начынне. Цару Аляксею Міхайлавічу ён зрабіў «в поднос тарелку черневую осьмигранную» [8, с. 29]. Выхадзец з Полацка Іван Андрэеў аздабляў вырабы з эмалямі. Творы майстра вызначаюцца вытанчанымі формамі, лаканічным выкарыстаннем дэкаратыўных дэталей. Малюнак раслінных матываў буйны, абагульнены, эмалі раздзяляюцца напаянымі перагародкамі [8, с. 28; 9, с. 133].

Сярод майстроў Сярэбранай палаты асаблівай вядомасцю карыстаўся Максім Сямёнаў з Копысі, «судового і черненого дела жалованный мастер». Ён чаканіў абклады, вырабляў рознае царкоўнае начынне. Майстры з Беларусі працавалі і ў Залатой палаце: Якаў Магілёвец, Мікалай Логінаў, Пятро Фёдараў і інш. [10, с. 71, 81]. Узоры работы беларускіх майстроў захаваліся да нашага часу ў сховішчах Маскоўскай аружэйнай палаты, у музеях Масквы і Санкт-Пецярбурга. Творы з’яўляюцца прыкладам надзвычайных традыцый беларускіх рамеснікаў XVII ст. і вызначаюцца выключным майстэрствам і высокай мастацкасцю.

Другая-трэцяя чвэрці XVIII ст. у еўрапейскім мастацтве адзначаны праявамі апошняй

стадыі барока – ракако, якое ў большай ці меньшай ступені выявілася і ў розных відах архітэктуры і мастацтва Беларусі, асабліва ў тых, што былі звязаны з унутраным аздабленнем інтэр'ера, гэта значыць у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Гэты мастацкі напрамак адлюстроўваў тагачасныя эстэтычныя ідэалы арыстакратыі і царкоўнай алігархіі і вызначаўся вытанчанасцю сродкаў мастацкай экспрэсіі, уражаннем лёгкасці і прывабнасці.

Аснову дэкору твораў складае разнастайная інтэрпрэтацыя формы ракавіны ў акаймоўцы складаных завіткоў і адмыслова выгнутых ліній. У выніку значнай стылізацыі ракавіна ператвараецца ва ўмоўны дэкаратыўны элемент пад назвай «ракайль». Некаторыя творы беларускіх майстроў досыць ярка дэманструюць праявы гэтага стылявога напрамку, павевы якога адчуваюцца нават і ў канцы XVIII ст. Да найбольш ранніх помнікаў гэтага стылю ў прыкладным мастацтве можна аднесці манстранц (1727 г.) з Волпы, да позніх – рызу абраза «Маці Боская Адзігітрыя Смаленская» Пятра Сліжыка і накладку труны (1774 г.). Выключэнне з усіх вядомых твораў складае напрастольны крыж (1789 г.) з Гродна, які звязаны з традыцыямі мастацтва XVII ст.

**Заключэнне.** У розных відах айчыннага мастацтва стыль барока выявіўся неаднолькава. Найбольш ярка ён сфарміраваўся ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі. Наогул, яно развівалася пад уздзеяннем розных мастацкіх школ і этнічных традыцый. Моцнымі былі старажытнарускі і візантыйскі ўплывы. З XIV ст. мастацтва Вялікага Княства Літоўскага развівалася ў рэчышчы готыкі, потым ренесансу, барока, ракако. Сярод розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі эпохі барока значнае месца займалі ювелірныя рамёствы, прадстаўленыя вялікай колькасцю майстроў. На Беларусі ў XVII ст. працавала не менш за 665 залатых спраў майстроў, дзейнасць якіх прыпадае ў асноўным на перыяд развіцця сталага барока [5, с. 17]. Майстры ювелірнай справы, засвоіўшы новыя тэхнічныя прыёмы чаканкі, якія дапаўняліся чарненнем, гравіраваннем, прасечкай, філігранню і іншымі відамі мастацкай апрацоўкі металаў, арнаментыку сталага барока і спалучыўшы іх з народнымі густамі, стварылі свой лакальны варыянт барочнага мастацтва.

Трэба заўважыць, што стварэнне ювелірных цэхаў па заходнееўрапейскім узоры ўскосна сведчыць пра даволі высокае эканамічнае і культурнае развіццё горада, трываласць попыту на прадметы з каштоўных металаў, якія з'яўляюцца адначасова і мастацкімі вырабамі.

## Літаратура

1. Высоцкая, Н. Ф. Спецыфіка барока ў Беларусі / Н. Ф. Высоцкая // Барока ў беларускай культуры і мастацтве / пад рэд. В. Ф. Шматава, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 47–48.

2. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVIII стст.: альбом / аўт.-склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 1984. – 232 с.

3. Барока ў беларускай культуры і мастацтве / пад рэд. В. Ф. Шматава, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 304 с.

4. Максимова, Э. С. История белорусского «злотництва» (от монастырских ювелиров к цеховым) / Э. С. Максимова // Царква і культура народаў Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі XIII – пач. XX стст.: матэрыялы міжнар. навук. канф., Гродна, 28 верас. – 1 кастр. 1992 г. / Наш радавод; рэдкал.: Д. Караў [і інш.]. – Гродна, 1992. – С. 537–542.

5. Высоцкая, Н. Ф. Искусство Беларуси XII–XVIII вв. / Н. Ф. Высоцкая. – Минск, 2002. – 26 с.

6. Жук, В. І. Узаемадзеянне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі з мастацтвам Еўропы ў 18 ст. / В. І. Жук // Культура ў Рэспубліцы Беларусь: гісторыя, сучасны стан і перспектывы развіцця / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск, 1993. – С. 21–23.

7. Беларусы: [у 12 т.] / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Беларус. навука, 1995–2009. – Т. 8: Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / [Я. М. Сахута]. – 2005. – 351 с.

8. Абецедарский, Л. С. Белорусы в Москве XVII в.: Из истории русско-белорусских связей / Л. С. Абецедарский. – Минск: Изд-во Белорус. гос. ун-та им. В. И. Ленина, 1957. – 64 с.

9. Постникова-Лосева, М. М. Русское ювелирное искусство, его центры и мастера XVI–XIX вв. / М. М. Постникова-Лосева. – М.: Наука, 1974. – 374 с.

10. Троицкий, В. И. Словарь московских мастеров золотого, серебряного и алмазного дела XVII века / В. И. Троицкий. – М.: Академия, 1928. – Вып. I. – 71 с.

*Паступіла 15.03.2012*